калектыўным досведам, але і эпохай, якая спараджае іх. Архетып ценю (схаванай адмоўнай сутнасці ў чалавеку або супольнасці) ўвасоблены А. Міцкевічам у паэме "Дзяды" ў розных сімвалічных мадыфікацыях, аб'яднаных адмоўнай канатацыяй: цень уяўляе сабой тое, што замінае гарманічнаму развіццю, парушае звыклы парадак рэчаў, тое, супраць чаго змагаецца герой. Выяўленне адметнасці сімвалічнага ўвасаблення архетыпа ў паэме адбываецца на суб'ектыўным узроўні асобнага персанажа, або на калектыўным узроўні супольнасці. Энергія архетыпа ценю не бывае нейтральнай, і калі яна не сублiміруецца ў творчасці, то выбухае разбурэннем. Цэласнасць асобы паэта Густава-Конрада ў пераадоленні архетыпа ценю ўзыходзіць да самасці – станаўлення асобы паэта-абуджальніка, змагара і пакутніка за свой народ. Дэманічная энергія (бунт супраць Бога, імкненне зраўняцца з ім) выступае праяўленнямі першапачатковай дваістасці ўсёй светабудовы: інтэграваныя з творчым пачаткам, яны могуць быць звернутыя да дабра.

У паэме А. Міцкевіча прызнанне і прыняцце персанажамі ўласнага ценю адбываецца таксама і ў перыяд іх пазачасавага і пазапрасторавага існавання – душы нябожчыкаў прыходзяць на пакаянне, прызнаюцца ў грахах жывым. Паказальнае прызнанне агрэсіўных, антысацыяльных момантаў жыцця пасля смерці праз традыцыйны абрад Дзядоў – пераадоленне часавай і прасторавай мяжы ў прызнанні ўласнага ценю па вертыкалі "рэальнае-ірэальнае", і гэта адпавядае светапоглядам у межах рамантычнай сацыякультурнай парадыгмы.

Уласцівасці ценю ў паэме выразна праектуюцца на ўладу як асноўнага ворага, увасобленага ў разнастайных гістарычна-дакладных і сацыяльна абумоўленых вобразах (цар, суддзі, губернатары, афіцэры, жандармы, паны), а таксама вобразамі чужынцаў (А. Міцкевіч мае на ўвазе іншы этнас: "маскалі", "прусак", "аўстрыяк"). Такім чынам, архетып ценю можа выступаць не толькі ў індывідуальнай, але і прымаць калектыўную форму. Калектыўная форма належыць да ліку фігур калектыўнага бессвядомага і сімвалізуе "іншы бок" пануючага духу часу, яго ўтоеную антытэзу – тое, што супрацьстаіць і перашкаджае гарманічнаму развіццю, парушае звыклы парадак і затармоўвае дынаміку.

**ЛІТАРАТУРА**


1. Юнг, К. Г. Проблемы души нашего времени / К. Г. Юнг. – СПб.: Питер, 2002. – 352 с.
2. Юнг, К. Г. Психология бессознательного / К. Г. Юнг. – М.: Канон +, 2003. – 400 с.
3. Юнг, К. Г. Архетип и символ / К. Г. Юнг. – М.: Renaissans, 1993. – 286 с.
4. Міцкевіч, А. Дзяды: у 2 т. / А. Міцкевіч; пер. С. Мінскевіч. – Мінск: Медысонт, 1999. – Т. 1. – 264 с.
5. Эдингер, Э. Ф. Эго и архетип / Э. Ф. Эдингер. – М.: Пента-График, 2000. – 264 с.
6. Міцкевіч, А. Дзяды: у 2 т. / А. Міцкевіч; пер. С. Мінскевіч. – Мінск: Медысонт, 1999. – Т. 2. – 470 с.


*Паступіў у рэдакцыю 15.12.2016 г.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**УДК 069:728.83:712(476.5)**

# Класіфікацыя сядзібна-ландшафтных комплексаў на тэрыторыі Віцебскай вобласці: неабходнасць новых падыходаў

***Герасімёнак Д. В.***

*Установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", Мінск*

*Працэсы глабалізацыі і хуткага развіцця сродкаў масавай інфармацыі прыводзяць да страты нацыянальнай ідэнтычнасці і самабытнасці народа. Сядзібы ў мінулым з'яўляліся найбольш выразнымі культурнымі і эканамічнымі ўтварэннямі Беларусі і ўключалі палацы і сядзібныя дамы, гаспадарчыя і вытворчыя збудаванні, капліцы, сады, паркі, водныя сістэмы, а таксама малыя архітэктурныя формы. Усе архітэктурныя і ландшафтныя элементы былі аб'яднаны адзінай логікай планіровачнай пабудовы, створаны ў адпаведнасці са стылёвымі прынцыпамі пэўнай эпохі. Сядзіба – гэта менавіта такі аб'ект гісторыка-культурнай спадчыны, дзе найбольш поўна захоўвалася памяць народа, таму і зараз яе вывучэнне спрыяе зберажэнню і далейшаму развіццю беларускай нацыянальнай культуры.*

*У артыкуле разглядаецца гісторыя развіцця і сучасны стан помнікаў сядзібна-паркавага мастацтва на тэрыторыі Віцебскай вобласці. На падставе аналізу шэрагу класіфікацый помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны, якія прапанаваны міжнароднай навуковай супольнасцю, робіцца спроба сістэматызаваць сядзібна-ландшафтныя комплексы рэгіёну для больш шырокага іх уключэння ў актуальную культуру.*

***Ключавыя словы:*** *музеі-сядзібы, музеефікацыя, актуалізацыя спадчыны.*

*(Искусство и культура. – 2017. – № 2 (26). – С. 65–69)*

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail: gerasimenok8@gmail.com – Д. В. Герасімёнак*

# Classification of Manor and Landscape Complexes on the Territory of Vitebsk Region: Necessity for New Approaches

**Gerasimenok D. V.**
*Educational Establishment «Belarusian State University of Culture and Arts», Minsk*

*Globalization processes and rapid development of mass media lead to the loss of national identity and originality of the people. Country estates were in the past the most expressive cultural and economic entities of Belarus and included palaces and manor houses, household and industrial buildings, chapels, gardens, parks, water systems and small architectural forms. All architectural and landscape elements were combined into single logic of composition structure, designed in accordance with the stylistic principles of a certain period. A country estate is an object of historical and cultural heritage, which preserved most complete memory of the people; therefore, its study contributes to the preservation and further development of the Belarusian national culture.*

*The article focuses on the evolution history and current status of landscape gardening and estate building in Vitebsk Region. Considering various classifications of historical and cultural heritage, the author is attempting to systematize the manor and landscape complexes of the Region for their wider inclusion in the current culture.*

***Key words:*** *estate museums, museumification, actualization of heritage.*

*(Art and Cultur. – 2017. – № 2 (26). – P. 65–69)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Захаванне нематэрыяльнай і матэрыяльнай культурнай спадчыны з'яўляецца адной з галоўных задач сучаснага грамадства. Менавіта сядзіба доўгі час з'яўлялася адным з асноўных асяродкаў фарміравання духоўнай і матэрыяльнай культуры, і ў выніку – адной з найважнейшых складаючых айчыннай культуры. Сядзібна-ландшафтны комплекс як помнік гісторыі і культуры праз захаванне і папулярызацыю гістарычнай памяці выступае значным фактарам фарміравання самасвядомасці насельніцтва.

Кодэкс аб культуры Рэспублікі Беларусь у главе 16 (артыкул 82) вызначае гісторыка-культурную спадчыну як сукупнасць найбольш адметных вынікаў і сведчанняў гістарычнага, культурнага і духоўнага развіцця народа Беларусі, увасобленых у гісторыка-культурных каштоўнасцях [1, с. 60]. Безумоўна, сядзібна-ландшафтны комплекс таксама з'яўляецца часткай гісторыка-культурнай спадчыны, а значыць знаходзіцца ў сферы інтарэсаў сучаснага грамадства.

Пад сядзібна-ландшафтным комплексам мы разумеем частку лакальнай прасторы, у склад якой уваходзяць культурны ландшафт пэўнай мясцовасці і размешчаныя на ёй помнікі сядзібна-паркавага мастацтва, значныя для захавання гісторыка-культурнага асяроддзя краіны або рэгіёну.

Сядзібы Віцебскага краю (Заходняе Паазер'е) не дастаткова шырока даследаваны ў сучаснай айчыннай літаратуры. Інфармацыя па дадзеных помніках гісторыі і культуры ў асноўным утрымліваецца ў энцыклапедычных выданнях "Архітэктура Беларусі", "Збор помнікаў гісторыі і культуры", кнігах "Памяць" па раёнах вобласці, манаграфіях А. П. Федарука "Садово-парковое искусство Белоруссии" і В. Г. Анціпава "Парки Белоруссии", асобных тэматычных выданнях, а таксама ў матэрыялах навуковых канферэнцый, прысвечаных гісторыі краю, перыядычных газетах і часопісах, інтэрнэт-рэсурсах.

Мэта артыкула – на аснове аналізу сучаснага стану сядзібна-ландшафтных комплексаў Віцебскага рэгіёну выпрацаваць класіфікацыйныя падыходы да сістэматызацыі дадзеных помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны на азначанай тэрыторыі.

**Кароткі агляд сучаснага стану сядзібнай спадчыны на тэрыторыі Віцебскай вобласці.** Віцебшчына валодае даволі багатай гісторыка-культурнай спадчынай, якая дайшла да нашага часу. Так, І. У. Шорац у навуковым артыкуле "Музеефікацыя помнікаў сядзібна-паркавага мастацтва Заходняга Паазер'я", абапіраючыся на класіфікацыю сядзіб, прапанаваную А. Т. Федаруком, адзначае, што сярод такіх аб'ектаў на тэрыторыі Віцебскай вобласці захавалася: сядзіб – 35, іх фрагментаў – 19, паркаў – 17, іх фрагментаў – 14, адзінкавых фрагментаў – 44. Пры гэтым аўтар артыкула заўважае, што большасць з названых помнікаў гісторыі і культуры з-за безгаспадарчых да іх адносін знаходзяцца пад пагрозай знішчэння [2, с. 151].

Для таго, каб пазбегнуць далейшага паскарэння вышэйадзначанага працэсу, трэба выпрацаваць асобныя падыходы да захавання і далейшага аптымальнага выкарыстання сядзібна-ландшафтных комплексаў. Пачаткам дадзенай работы мы лічым неабходнасць распрацоўкі такой класіфікацыі, якая зможа ў будучым накіраваць увагу грамадства і дзяржавы на найбольш перспектыўныя ў плане захавання помнікі сядзібна-паркавага мастацтва.

Сядзібы на Віцебшчыне развіваліся ў рэчышчы, характэрным для ўсёй беларускай тэрыторыі. Немалаважнае значэнне пры будаўніцтве сядзіб у рэгіёне Заходняга Паазер'я мелі кліматычныя ўмовы (вялікая колькасць азёр, гарысты рэльеф, больш суровы клімат) і культурна-канфесійныя (перавага праваслаўнага насельніцтва). Уладальнікамі сядзіб на тэрыторыі Заходняга Паазер'я былі

вядомыя дваранскія роды: Друцкія, Валадковічы, Лапацінскія, Агінскія, Панятоўскія, Сапегі, Храптовічы, Цеханавецкія і інш.

З мастацкага пункту гледжання помнікі сядзібна-паркавага мастацтва рэгіёну прадстаўлены некалькімі архітэктурнымі стылямі: барока, класіцызм, эклектыка і інш. У барочным стылі была пабудавана Леанпольская сядзіба (Мёрскі раён), адзіная з гэтага разраду, якая захавалася да нашых дзён. Сярод сядзіб, створаных у стылі класіцызму, папулярным у сярэдзіне XVIII – пач. XIX ст. былі: Бешанковіцкая, Шаркаўшчынская, Відзы-Лаўчынская (Браслаўскі раён), Германавіцкая, Гарадзецкая (Шаркаўшчынскі раён), Дворнізгалаўская (Бешанковіцкі раён), Дзедзінская (Мёрскі раён), Мазалоўская "Мілае" (Віцебскі раён), Арэхаўнецкая (Ушацкі раён) і інш. З другой паловы XIX ст. у сядзібнай архітэктуры Віцебскага краю панавала эклектыка (сядзібы ў Высокім і Межава Аршанскага раёна). У неагатычным стылі былі пабудаваны Расонская, Залеская сядзібы Глыбоцкага раёна; неакласічным – Бездзедавіцкая (Полацкі раён), Опсаўская (Браслаўскі раён), Вопытнаўская (Верхнядзвінскі раён), Беліцкая (Сенненскі раён) [3, с. 542–543].

Традыцыйна сядзібы ўключалі палацы або сядзібныя дамы, гаспадарчыя і вытворчыя пабудовы (кузні, флігелі, млыны і інш.), капліцы, сады, аранжарэі, водныя сістэмы. Нярэдка ў некаторых сядзібных комплексах ствараліся бібліятэкі, архівы, музеі, кабінеты для заняткаў навуковай дзейнасцю. Так, у Пастаўскай сядзібе К. Тызенгаўза быў створаны арніталагічны музей, у Крашуцкай сядзібе (Полацкі раён) мелася карцінная галерэя, у якой знаходзіліся творы мастацтва, вывезеныя ў 1814 г. з Парыжа.

Як і на іншых тэрыторыях, сядзібы Віцебшчыны з'яўляліся цэнтрамі эканамічнага жыцця рэгіёну, іх уладальнікамі часта ўкараняліся, а затым і распаўсюджваліся пэўныя агратэхнічныя новаўвядзенні, недаступныя сялянам і беднай шляхце. Падчас знаходжання Віцебскай губерні ў складзе Расійскай імперыі невялікія дваранскія маёнткі сталі цэнтрамі навукі і культуры. На Віцебшчыне вялі актыўную навуковую і грамадскую дзейнасць В. Адамаў, Т. Ваўжэцкі, А. Ромер, Я. Баршчэўскі, І. Хруцкі, А. С. Бялыніцкі-Біруля, І. Буйніцкі, І. Я. Рэпін і інш.

Да пачатку XX ст. на Віцебшчыне налічвалася больш за 1000 сядзіб. Пасля рэвалюцыі 1917 г. значная частка дадзеных помнікаў гісторыі і культуры на тэрыторыі сённяшняй усходняй і цэнтральнай Віцебскай вобласці былі разрабаваны, разбураны або разабраны на будаўнічыя матэрыялы. У некаторых сядзібах былі створаны навучальныя ўстановы, вопытныя сельскагаспадарчыя прадпрыемствы. Сядзібы заходняй Віцебшчыны падчас Першай сусветнай вайны моцна пацярпелі. Большасць з іх была разбурана ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Многія сядзібна-паркавыя комплексы да пачатку XXI ст. прыйшлі ў заняпад і цяпер патрабуюць правядзення ахоўных мерапрыемстваў і аднаўлення [3, с. 543].

**Класіфікацыйныя падыходы да вызначэння сістэматызацыі сядзібнай спадчыны Віцебшчыны.** Як сказана вышэй, Віцебшчына мае даволі разнастайнае прадстаўніцтва сядзіб пэўных гістарычных эпох і, адпаведна, мастацкіх стыляў, што адбіваецца на складанасці іх абагульнення і сістэматызацыі.

Самая першасная класіфікацыя азначаных помнікаў гісторыі і культуры на тэрыторыі Віцебскай вобласці можа быць заснавана на *формах вытворчай арганізацыі* (сядзібы, маёнткі, фальваркі), *уласнасці* (дзяржаўныя, прыватнаўласніцкія), *архітэктурных стылях, матэрыялах пабудовы, даце стварэння* таго ці іншага сядзібна-паркавага комплекса, *ступені* яго *захаванасці* і г. д.

Класіфікацыя, прапанаваная Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь, заснавана на *навуковай ацэнцы* гісторыка-культурнай каштоўнасці для грамадства таго ці іншага помніка гісторыі і культуры. Так, у нашай краіне быў створаны і пастаянна папаўняецца Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Матэрыяльныя аб'екты, якія ўносяцца ў дадзены спіс, прызнаюцца помнікамі адной з 4 катэгорый, пазначанай лічбамі (0, 1, 2, 3) і бяруцца пад ахову дзяржавы. У залежнасці ад свайго значэння, гісторыка-культурныя каштоўнасці падзяляюцца на:

0 – гісторыка-культурныя каштоўнасці, уключаныя або прапанаваныя да ўключэння ў спіс сусветнай спадчыны;

1 – унікальныя мастацкія, эстэтычныя і дакументальныя аб'екты міжнароднага значэння;

2 – аб'екты гісторыка-культурнай спадчыны рэспубліканскага значэння;

3 – гісторыка-культурныя каштоўнасці рэгіянальнага значэння [4].

На тэрыторыі Віцебскай вобласці на 2009 г. у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь было ўключана 10 сядзіб ў якасці матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці другой катэгорыі, сядзібы ў в. Відзы-Лаўчынскія, в. Опса, в. Дзедзіна і інш. Да трэцяй катэгорыі аднесены 14 сядзібных комплексаў: в. Межава, в. Здраўнева, в. Каменполле і інш.

Відавочна, што класіфікацыя, прапанаваная з боку дзяржавы, не ўлічвае такую спецыфічную рысу гісторыка-культурнай спадчыны, як яе атрактыўнасць (прыцягальнасць для наведвальнікаў). Напрыклад, сядзіба І. Я. Рэпіна аднесена да 3 катэгорыі, хаця на яе базе створаны музей, ладзяцца тэматычныя вечарыны. Для простых наведвальнікаў (турыстаў і экскурсантаў) каштоўнасная ацэнка пакідае па-за ўвагай сучаснае функцыянальнае прызначэнне помніка.

Наступная класіфікацыя, апублікаваная ў калектыўнай працы "Словарь актуальных музейных терминов", у значнай ступені тэарэтычная, хаця і заснавана на магчымых *напрамках выкарыстання* помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны:

– па першапачатковаму прызначэнню;

– па прызначэнню, якое адрозніваецца ад першапачатковага, але не наносіць шкоды каштоўным якасцям аб'ектаў;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– у мэтах прэзентацыі і навуковага вывучэння;

– па прызначэнню, якое не звязана з першапачатковым [5, с. 49].

Дадзеныя кірункі выкарыстання спадчыны маглі б паслужыць падставай для спробы класіфікаваць сядзібы на тэрыторыі Беларусі, у тым ліку і Віцебскага краю, таму што яна непасрэдна звязана з праявамі чалавечай жыццядзейнасці. Аднак ніводная сядзіба зараз не выкарыстоўваецца па першапачатковаму прызначэнню з-за змен у сацыяльна-эканамічным жыцці краіны. Па сутнасці, мы можам гаварыць аб выкарыстанні сядзіб у якасці музейных і культурна-асветніцкіх устаноў, якія амаль не ўплываюць на каштоўныя якасці гэтых помнікаў, ці па прызначэнні, якое таксама не звязана з першапачатковым, але фармальна дазваляе падтрымліваць азначаныя аб’екты гісторыі і культуры ў належным стане (напрыклад, адміністрацыйныя, рэкрэацыйныя ўстановы).

Нельга пакінуць па-за ўвагай і спробы класіфікацыі помнікаў, абапіраючыся на міжнародны вопыт, на падставе якога выпрацаваны разнастайныя спосабы выкарыстання помнікаў гісторыі і культуры *па функцыянальным прызначэнні*, якія можна аб’яднаць у наступныя групы:

– музейная (музеі-запаведнікі, музеі-сядзібы, дамы-музеі і інш.);

– культурна-асветніцкая (бібліятэкі, дамы культуры і інш.);

– грамадская (напрыклад, адукацыйныя і навуковыя ўстановы);

– жылая (выкарыстанне як прыватнага жылля);

– рэкрэацыйная (выкарыстанне пад установы адпачынку, санаторна-курортнай гаспадаркі як аб’екта турызму) [6, с. 56].

Такім чынам, першую групу помнікаў азначанай класіфікацыі можна назваць адпавядаючай духоўным запатрабаванням грамадства. Аднак і дзве наступныя групы помнікаў, эксплуатуемыя пад асветніцкія, адукацыйныя і іншыя патрэбы, могуць быць уключаны ў працэс актуалізацыі гісторыка-культурнай спадчыны пры цікавасці да іх захавання як аб’ектаў турыстычнага паказу з боку дзяржавы і грамадства. Помнікі гісторыі і культуры апошніх дзвюх груп маюць тэндэнцыю да перабудовы пад гасцініцы ці жыллё, што памяншае магчымасці іх захавання і выкарыстання ў якасці аб’ектаў паказу ў далейшым.

На наш погляд, менавіта музеефікацыя зможа забяспечваць максімальнае захаванне і выкарыстанне помнікаў гісторыі і культуры. Адной з першых, хто звярнуў увагу на праблему вызначэння класіфікацыі комплексаў архітэктуры і прыроды менавіта ў адносінах да музейнай дзейнасці, была Д. А. Равіковіч, якая прапанавала класіфікацыю музеяў *па прыкмеце ажыццяўлення* імі сваіх *навукова-дакументацыйных функцый*. У адпаведнасці з гэтай класіфікацыяй вылучаюць музеі калекцыйнага (традыцыйнага) і ансамблевага тыпаў [7, с. 23].

Калі музей калекцыйнага тыпу (прыстасаванне помніка “пад музей”) збірае, захоўвае і вывучае калекцыі прадметаў, якія адпавядаюць профілю музея (гістарычны, літаратурны, комплексны і г. д.), то ансамблевыя музеі грунтуюць сваю дзейнасць пераважна на ансамблях канкрэтных нерухомых помнікаў архітэктуры, гісторыі і прыроды (выкарыстанне помніка “як музей”). Унутры гэтай групы вылучаюцца музеі пад адкрытым небам (у тым ліку і музеі-запаведнікі), палацы-музеі, музеі-сядзібы, дамы-музеі і інш.

Як бачна, дадзеная класіфікацыя ахоплівае толькі помнікі, на якія накіравана музейная дзейнасць. Мы прапануем уласную класіфікацыю, якая, на нашу думку, дазваляе ўлічыць як навуковую каштоўнасць аб’екта, так і ступень яго захаванасці і прыстасаванасці пад задавальненне духоўных патрэб грамадства, а таксама магчымасць розных падыходаў да іх актуалізацыі. Сядзібна-ландшафтныя комплексы можна падзяліць наступным чынам:

1. Сядзібы, прыдатныя для актуалізацыі былых пластоў матэрыяльнай і духоўнай культуры, на аснове якіх можна ствараць (ці ўжо створаны) музеі, тым самым найбольш поўна прэзентаваць гісторыка-культурную спадчыну пэўнай мясцовасці. Дадзеную групу можна падзяліць на дзве падгрупы (адпаведна А і Б). Да падгрупы “А” адносяцца сядзібна-паркавыя комплексы, у якіх на цяперашні час размяшчаюцца музейныя ўстановы (в. Германавічы, в. Здраўнёва). Сядзібы падгрупы “Б” зараз выкарыстоўваюцца як адміністрацыйныя, рэкрэацыйныя і, нават, рэлігійныя ўстановы (г. Бешанковічы – школа мастацтваў, в. Межава – праваслаўны храм), што дазваляе падтрымліваць помнікі ў належным выглядзе. Гэтыя аб’екты рэальна ў кароткі тэрмін прывесці да музеефікаванага стану, што стварала б шырокія магчымасці па раскрыцці назапашанага ў іх гісторыка-культурнага патэнцыялу.

2. Помнікі са значным гісторыка-культурным патэнцыялам (в. Бачэйкава, в. Двор-Нізгалава, в. Відзы-Лаўчынскія і інш.). Дадзеная група таксама можа быць уключана ў сферу музейных інтарэсаў, такім жа чынам як і першая, аднак патрабуе значных фінансавых капіталаўкладанняў (рэстаўрацыя і аднаўленне помнікаў). Магчымасці для іх актуалізацыі можна ажыццявіць уключэннем помнікаў у турыстычныя маршруты ці шляхам правядзення тэматычных мерапрыемстваў.

3. Ансамблі помнікаў сядзібна-паркавага мастацтва, якія не дайшлі да нашага часу (в. Дабрыгоры, в. Ахрэмаўцы, в. Вазгелянцы, в. Даўблі і інш.). Пры прэзентацыі дадзеных помнікаў гісторыі і культуры існуюць пэўныя складанасці, абумоўленыя станам іх захаванасці (засталіся рэшткі сядзібнага дому, руіны гаспадарчых пабудоў ці фрагментарна захаваўся парк). Гэтая група, па сутнасці, выключана з інфармацыйнай прасторы грамадства, аднак памяць пра факт існавання дадзеных помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны можа падтрымлівацца шляхам іх аднаўлення (як, напрыклад, сядзіба І. Я. Рэпіна “Здраўнёва”, Віцебскі раён), або выкарыстання

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў якасці аб'ектаў экскурсійнага паказу ўстановамі першай і другой групы.

Выкарыстоўваючы дадзеную класіфікацыю, можна ў кароткі тэрмін вызначыць прыярытэтныя для ўключэння ў сучасную сацыякультурную прастору сядзібна-ландшафтныя помнікі Віцебскай вобласці. Безумоўна, на аснове гістарычных сядзіб мэтазгодна стварэнне культурна-турыстычных аб'ектаў. Больш увагі трэба надаваць не толькі навуковай каштоўнасці азначаных помнікаў гісторыі і культуры, але і пытанням прыцягальнасці таго пласту культуры, які непарыўна звязаны з самой сядзібай, для наведвальнікаў-экскурсантаў.

**Заключэнне.** У цяперашні час музей і экскурсійная дзейнасць праз прапаганду гісторыка-культурнай спадчыны можа абудзіць актыўную цікавасць сучаснага грамадства і будучых пакаленняў да справы захавання гістарычнай памяці нашага народа, раскрыць самабытнасць культурнай спадчыны краіны ў сусветным кантэксце. Вызначэнне класіфікацыі гісторыка-культурнай спадчыны Віцебшчыны ўзбагачае сферу інтарэсаў музейнай навукі, пашырае кола аб'ектаў для стварэння самастойных музеяў, а таксама звяртае ўвагу грамадства на праблемы функцыянавання сядзібна-ландшафтных комплексаў у сучаснай сацыякультурнай прасторы.

**ЛІТАРАТУРА**


1. Кодекс Рэспублікі Беларусь аб культуры: уступае ў сілу з 3 лютага 2017 г. – Мінск: Нац. цэнтр прававой інфарм. Рэсп. Беларусь, 2016. – 272 с.
2. Шорац, І. У. Музеефікацыя помнікаў сядзібна-паркавага мастацтва Заходняга Паазер'я / І. У. Шорац // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – Мінск, 2006. – № 6. – С. 146–152.
3. Пивовар, Н. В. Усадьбы / Н. В. Пивовар // Регионы Беларуси: энцыклопедия: в 7 т. В 2 кн. / редкол.: Т. В. Белова (гл. ред.) [и др.]. – Минск: Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2011. – Т. 2. Витебская область. Кн. 2. К-Я. – 640 с.
4. Аб статусе гісторыка-культурных каштоўнасцей : пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, 14 мая 2007 г., № 578 // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2007. – № 119. – 5/25167.
5. Каулен, М. Е. Словарь актуальных музейных терминов / М. Е. Каулен, А. А. Сундиева, И. В. Чувилова [и др.] // Музей. – 2009. – № 5. – С. 47–68.
6. Международная конференция «Исторические усадьбы Беларуси: состояние и перспективы», 4–5 сент. 2003 г., д. Залесье (бывшее имение М. К. Огинского), Сморгон. р-н, Гродн. обл. – Минск: Четыре четверти, 2003. – 189 с.
7. Равикович, Д. А. Социальные функции и типология музеев / Д. А. Равикович // Музееведение. Вопросы теории и методики. – М., 1987. – С. 19–24.


*Паступіў у рэдакцыю 27.02.2017 г.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**УДК [028+004.9]:027.7:6-057.876**

# Информационная культура учащихся колледжа технического профиля: теоретический аспект

***Политевич Е. Э.***

*Учреждение образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств», Минск*

*Раскрывается теоретический этап исследования сущности формирования информационной культуры учащихся колледжа технического профиля в библиотеке и, как следствие, определяется формулировка «информационная культура учащихся колледжа технического профиля», компонентная структура, функции и принципы ее развития. Формирование информационной культуры учащихся колледжа технического профиля в библиотеке ведет к изменению информационного поведения в условиях информационно-образовательной среды библиотеки, выдвигая на передний план умения и навыки по осуществлению информационной деятельности учащихся, усиливает роль и значение мировоззренческих ориентиров, знаний и способностей при подготовке специалистов в учреждениях среднего специального образования технического профиля, а также дает возможность успешного использования результатов этого вида деятельности для эффективного осуществления учебно-познавательной, технической творческой и будущей профессиональной деятельности. Обоснована необходимость выявления функций и принципов формирования информационной культуры учащихся, позволяющих определить ее роль в успешном осуществлении учебно-познавательной, технической творческой и будущей профессиональной деятельности.*

***Ключевые слова:*** *информационная культура, учащиеся колледжа, принципы формирования информационной культуры учащихся.*

*(Искусство и культура. – 2017. – № 2 (26). – С. 69–75)*

*Адрес для корреспонденции: e-mail: alena020683@mail.ru – Е. Э. Политевич*